ным чынам не могуць. Гэта залежыць ад таго, наколькі паспяхова функцыяніруюць праграміруючая і выканаўчая сістэмы, наколькі добра яны ўзаемасвязаны.

Жылінская Н.П.,
выкладчык

## ВЫХАВАЎЧАЯ РОЛЯ І ЭСТЭТЫЧНАЕ ЎЗДЗЕЯННЕ ФАЛЬКЛОРУ НА СТУДЭНТАЎ У ПЕРЫЯД ІХ РАБОТЫ З ФАЛЬКЛОРНЫМ МАТЭРЫЯЛАМ

У працэсе выкладання вакальных і дырыжорска-харавых дысцыплін работа з песенным фальклорным матэрыялам займае адно са значных месцаў. Гэта абумоўлена багаццем і разнастайнасцю народнага мастацтва беларусаў. У ім увасоблены вялікі вопыт пакаленняў. Дамінуючае месца ў фальклоры займае народная песня. Яна адлюстроўвае свабодалюбівы характар беларусаў, іх працоўную дзейнасць, сацыяльныя і сямейныя адносіны. У песнях выказаны думкі, пачуцці і жаданні народа-аўтара.

Цяжка пераацаніць выхаваўчую ролю фальклору і яго ўздзеянне на духоўнае жыццё народа. Творы фальклору вучаць любіць свой край, родную мову, з павагай адносіцца да людзей, захоўваць самабытнасць сваёй нацыянальнай культуры. З фальклорным песенным матэрыялам студэнт сутыкаецца на працягу ўсіх гадоў навучання ва універсітэце: спачатку на занятках па спецдысцыплінах, дзе ён набывае неабходныя тэарэтычныя веды (тут прадугледжваюцца міжпрадметныя сувязі), потым на практычных занятках (фальклорныя экспедыцыі, вытворчая практыка, праца ў сваіх калектывах), дзе ён ужо самастойна выкарыстоўвае набытыя веды. І на працягу ўсей працы з фальклорным матэрыялам ад студэнта патрабуюцца не толькі беражлівыя адносіны да багацця народнай творчасці, але і ўменне данесці да слухача ўсю прыгажосць гучання песні, паказаць каларыт народных абрадаў.

Вось таму з самага пачатку працы выкладчык павінен навучыць студэнтаў карыстацца гэтым матэрыялам, ведаць яго. Выкладчык ставіць перад сабой мэту накіраваць работу на пашырэнне музычнага і агульнакультурнага кругагляду студэнтаў, ведаць разнастайныя фальклорныя творы, падрыхтаваць студэнтаў да самастойнай працы над творамі, умець усебакова аналізаваць іх.

Выхоўваць у студэнтаў навыкі музычнага мыслення, паглыбленага разумення зместу фальклорнага твора, развіваць мастацкі густ, неабходны для збору і падбору якаснага рэпертуару для народных хароў і фальклорных ансамбляў, - гэта задачы выкладчыка. Яму патрэбна пераканаць студэнтаў у неабходнасці набыцця тэарэтычных і практычных ведаў, якія павінны дапамагчы ім выпрацаваць разнастайныя навыкі, навучыцца рабіць запіс народных песень у адпаведнасці з патрабаваннямі навуковай фальклорыстыкі. І яшчэ вельмі важна ў перыяд навучання пачаць выкарыстоўваць набытыя навыкі ў практыцы.

Працэс нацыянальна-культурнага адраджэння на Беларусі ў апошнія гады ўсе больш і больш павышае зацікаўленасць грамадскасці народнымі формамі мастацтва, асабліва музычнага фальклору. Гэта выклікана высокімі мастацкімі якасцямі народных песень, прыпевак, прыказак і твораў іншых жанраў. Раскрытая на занятках выкладчыкам у яркіх паэтычных вобразах гісторыя жыцця працоўных здольна зацікавіць студэнта, абудзіць, ускалыхнуць у ім пачуцці любові да роднага краю і замілавання ім, сыноўняй гордасці за гераічнае мінулае і сучаснае свайго народа. Жывыя паэтычныя словы ў спалучэнні з цудоўнымі мелодыямі раскрываюць багацце народнай душы, сілу і моц народнага духу, узмацняюць веру студэнтаў ў вялікую будучыню свайго народа, яго шчаслівае заўтра.

Снапкова Л.В.,
ст.выкладчык

## НЕКАТОРЫЯ АСАБЛІВАСЦІ РАБОТЫ З ДЗІЦЯЧЫМ ФАЛЬКЛОРНЫМ КАЛЕКТЫВАМ

У наш нялегкі час у большасці ўстаноў культуры перасталі існаваць выдатныя хары, якія мелі званне «народны» і выдатную гісторыю свайго развіцця. Народная песня - аснова музычнай культуры, найвялікшае музычна-паэтычнае дасягненне народа. Далучэнне дзяцей да народнай музыкі набывае ў цяперашні час асаблівую актуальнасць. За апошнія гады шырокае развіцце ў дзіцячай самадзейнасці атрымаў фальклорны ансамбль. Фальклору адводзіцца значная роля ў справе духоўнага і эстэтычнага выхавання дзяцей. Таму ў курс «Методыка работы з харавым калектывам» уведзены раздзел работы з дзіцячым фальклорным калектывам.

Работа па засваенню народнай спадчыны ў дзіцячых фальклорных калектывах мае шэраг спецыфічных асаблівасцей, якія адрозніваюць яе ад работы з дарослым народным хорам, а таксама з дзіцячым калектывам акадэмічнага тыпу. Асноўныя задачы выкладчыка ў рабоце з будучымі кіраўнікамі дзіцячых фальклорных калектываў наступныя:

- пазнаёміць студэнтаў са спецыфікай дзіцячага фальклорнага калектыву, раскрыць творчы характар яго дзейнасці;

- даць неабходныя звесткі пра асаблівасці дзіцячага голасу і характар яго развіцця, пра неабходнасць яго ахоўы;

- прывіць асноўныя навыкі вакальнай работы з дзіцячым народна-харавым калектывам;

- сфарміраваць у будучых спецыялістаў мастацка-каштоўнасную арыентацыю на авалоданне прынцыпам адбору фальклорнага матэрыялу і яго максімальнага выкарыстання ў выхаваўчай і музычна-адукацыйнай мэтах.

У працэсе занятказ студэнты знаёмяцца з гісторыяй збору і выдання дзіцячых фальклорных матэрыялаў, відамі фальклорных калектываў, асаблівасцямі іх дзейнасці.

Вялікая ўвага пры вывучэнні курса ўдзяляецца праблеме пеўчага выхавання дзяцей. У сувязі з гэтым разглядаюцца асаблівасці народнай манеры спеваў дзяцей, даецца характарыстыка развіцця галасоў у дзяцей у залежнасці ад іх узросту.

Вялікае месца ў жыцці дзіцяці займаюць гульні. Гэта адна з асноўных формаў іх дзейнасці. Беларускія гульні, як наогул гульні ўсходніх славян, цесна звязаны з земляробчай дзейнасцю чалавека, яны заснаваны на пераймаіші рухаў, дзеянняў пры пэўных сельскагаспадарчых работах: «Проса», «Мак» і інш. Характар гульняў мяняецца перш за ўсё ў залежнасці ад узросту дзяцей, які ўплывае не толькі на форму гульні, але і на яе складанасць.

Са сказанага вышэй вынікае, што аснову дзіцячага рэпертуару складаюць творы гульнявога характару (калыханкі, забаўлянкі, лічылкі, дражнілкі, гульні-карагоды). Падыходзяць для выканання і каляндарныя песні. Знаёмства са старажытнымі абрадамі калядавання і сустрэчы вясны развівае кругагляд, выхоўвае цікавасць і любоў да жыцця і быту свайго народа. Для пачынаючых удзельнікаў гэтыя песні маюць вялікае значэнне, паколькі ў іх невялічкі аб'ем і выразная мелодыка.

У сельскай мясцовасці песні дарослых засвойваліся дзецьмі з ранняга ўзросту. Таму творы ўсіх традыцыйных жанраў могуць быць выкарыстаны ў практычнай рабоце з дзецьмі. Трэба толькі падысці да гэтай справы разумна, выбраць лепшыя музычныя творы з пункту гледжання мастацкага зместу, даступныя дзіцячаму ўспрыманню (лірычныя, купальскія, восеньскія, вясельныя і інш.).

Грамовіч І.М.,
выкладчык

# ЗАСВАЕННЕ АСАБЛІВАСЦЕЙ НАРОДНА-ПЕСЕННЫХ ТРАДЫЦЫЙ У ПРАЦЭСЕ ПАДРЫХТОЎКІ КІРАЎНІКОЎ ФАЛЬКЛОРНЫХ КАЛЕКТЫВАЎ

У аснове народна-песенных традыцый ляжыць адпаведная вакальна-тэхнічная культура выканання. Песенныя навыкі і работа над іх удасканаленнем з'яўляюцца галоўным элементам, вакол якога арганізуюцца ўсе астатнія этапы навучання народнай манеры спеваў.

Пошукі шляхоў навучання вакальнаму майстэрству ідуць пастаянна. Каб спяваць народную песню так, як спяваюць яе лепшыя народныя выканаўцы, патрэбна вучыцца спевам. А гэта доўгі і складаны працэс. Адраджэнне народнага мастацтва на Беларусі дало магчымасць стварыць новы падыход да вывучэння народнай манеры спеваў і падрыхтоўкі кадраў для фальклорных гуртоў. Праблема навучання народнай манеры спеваў павінна разглядацца ў кантэксце захавання і развіцця рэгіянальных народна-песенных традыцый і непасрэдна ў сувязі з багатай практыкай народных спеваў наогул. Беларускія народныя гуртавыя спевы перажываюць зараз важны этап свайго развіцця. Назапашаны каштоўны вопыт збірання песеннага фальклору, канцэртнай дзейнасці фальклорных калектываў, вывучэння выканання беларускай народнай песні. Гэтыя дасягненні даюць магчымасць стварыць навукова абгрунтаваную методыку навучання народна-песеннаму выкананню ў музычных навучальных установах, а таксама ў Беларускім універсітэце культуры. Будучыя кіраўнікі фальклорных гуртоў і выканаўцы павінны добра ведаць асновы народнай манеры спеваў і валодаць ёй. У вакальнай педагогіцы неабходна з'яднаць папярэдні вопыт навучання народнай манеры спеваў, вынікаў даследаванняў у галіне фальклорных традыцый рэгіёнаў Беларусі з практычнай вакальнай работай у навучальных установах і фальклорных гуртах. Ва ўмовах адзінства працэсаў выканання і выхавання ўзнікла неабходнасць своеасаблівых, спецыфічных спосабаў кіравання навучаннем. У калектывах з бытавой манерай выканання - гэта арыентацыя на методыку вуснай традыцыі, заснаванай на інтуіцыі, здагадцы, імітацыі.

Вучэбна-мастацкая дзейнасць гуртоў сцэнічнага ці стылізаванага накірунку мае свае характэрныя рысы. Яны абумоўлены своеасаблівым падыходам да актуалізацыі фальклорнага спосабу функцыяніравання мастацкіх каштоўнасцей. У гэтых калектывах праводзіцца работа з выканаўцамі па:

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ